— У нас еще действует социальный фактор: самолечение, программы типа «Малахов плюс…», другие волшебники по телевизору. Народ сам ходит в аптеки, пьет что попало, естественно, схемы не соблюдает. Часто у людей нет даже элементарной ответственности. Не зря ВОЗ ввела термин «социальное дистанцирование», то есть, если заболели, держитесь на расстоянии одного метра от окружающих. Помогают самые обычные вещи, про которые все как бы забыли: проветривать помещения, делать влажную уборку, мыть руки…



# Операция «Маска»

О том, как вести себя во время пандемии, рассуждают многие медицинские светила. Их рекомендации сводятся к элементарным вещам: нужно нормально питаться и спать, прикрывать рот, когда кашляешь, и по возможности носить одноразовую маску. По идее тонкий слой ткани может защитить от летящего по воздуху вируса.

Корреспондент «РР» попробовала выполнить эту норму эпидемической безопасности — провести весь день в маске.

— Девушка, вы уже пятнадцатая, кто спрашивает про маску. Не привезли еще. Приходите в понедельник, у нас завоз будет. Все как с ума сошли — только их и берут…

В следующей аптеке маска нашлась. Но там тоже пожаловались:

— В последние три дня какой-то бум! Все градусники и маски расхватывают — не успеваю раскладывать. Маски очень быстро разбирают. Покупать-то — покупают, но вот что с ними дальше делать, не все знают. Сегодня одна женщина пришла, купила и стоит — в руках ее вертит. «Хотела, — говорит, — надеть, взяла и не решаюсь — непривычно это как-то все».

Итак, маска куплена. Но ходить в ней по городу оказалось непросто. Единственное место, где в маске чувствуешь себя полноценным, — поликлиника. Там, если кто-то появляется с неприкрытым лицом, сразу ощущает всеобщее недовольство. Во всех остальных общественных местах «масочники» чувствуют себя дискриминируемым меньшинством.

— Ты глянь, глянь, что у нее на лице. Заразная пришла. Лучше бы дома сидела, — раздраженно шипит пожилая женщина на автобусной остановке и испуганно отходит в сторону.

В метро рядом садится крупная женщина лет сорока.

— У тебя «свиной» грипп? — спрашивает.

— Нет. Просто заразиться боюсь.

— Ну, понятно. Я тоже сначала носила. А потом, когда заболела, перестала. Не хочу, чтобы на меня смотрели, как на врага народа.

# Как распознать «свинью»

ПЦР. Полимераз-цепная реакция. Только такая методика позволяет однозначно распознать новый вирус. Все утверждения вроде: «Нутром чую — у меня именно «свиной» грипп…» — не более чем игра в угадайку.

Выяснить, нет ли у тебя «свиного» гриппа, довольно просто. При первых симптомах похожей болезни нужно отказаться от самолечения и вызвать участкового врача, сообщив о своих подозрениях. Если врач сочтет, что ваше предположение верно, то вызовет специалистов из санэпидемстанции, которые возьмут у вас соскобы из носа и ротоглотки. После этого в течение двух дней к вам может приехать «скорая» — это значит, что ваши страхи были не напрасны. Анализы в этом случае будут абсолютно бесплатными.

Другой вариант — обратиться в лабораторию, работающую на коммерческой основе. Тогда исследование будет стоить чуть больше 1000 рублей. В одной из таких лабораторий нас заверили, что всех желающих сделать анализ на «свиной» грипп пропускают без очереди и в обязательном порядке выдают защитную маску. Результаты — через те же два дня.

Вроде бы лаборатории, оснащенные оборудованием для диагностики «свиного» гриппа, работают в большинстве крупных городов. Например, одна из вспышек эпидемии была зафиксирована в Ямало-Ненецком округе: в тундре заболели 17 детей. Считается, что вирус пришел от иностранных специалистов, приезжавших на стойбище.

Заведующая инфекционным отделением Центральной городской больницы Ноябрьска Галина Орлова объяснила нам, как происходит диагностика:

— Мы обследуем на вирус только часть больных, обращаем внимание на тех, кто заболел за границей, контактировал с заболевшими «свиным»

## ВИРУСНЫЙ ИНТЕРНАЦИОНАЛ

**Великобритания.** Вакцинацию прошли уже больше 10 млн человек. В основном это представители группы риска — беременные женщины, астматики, диабетики и работники здравоохранения. В ближайшее время правительство планирует привить всех детей и подростков до 18 лет. Великобритания пострадала от «свиного» гриппа сильнее других стран Европы.

**Германия.** Здесь заболевших около 25 тысяч. Вакцинация от вируса началась 26 октября.

**Бразилия.** Пока эта страна удерживает лидерство по числу умерших от «свиного» гриппа. На момент сдачи этого текста погибло 1368 человек. Бразильские биотехнологи планируют изготовить 18 млн доз вакцины к началу следующего года, одновременно власти Бразилии покупают диагностические материалы и вакцину за рубежом, в частности, во Франции.

**Украина.** Статистические данные сильно расходятся. Называют разное количество погибших, причина смерти в большинстве случаев не уточняется. В школах и вузах были объявлены трехнедельные каникулы. Власти в экстренном порядке купили 300 тысяч доз тамифлю за рубежом.

**США.** Барак Обама объявил «свиной» грипп «прямой угрозой национальной безопасности». От этого вируса умерло более тысячи человек, лишь в четырех штатах вирус еще не зафиксирован. Прививки начались 5 октября, в ближайшие месяцы обещают распространить 150 млн доз вакцин.

**Китай.** Масштабная вакцинация началась 22 октября.

гриппом и иностранными гражданами. Всех проверить невозможно, так как это достаточно затратно. Лаборатория, куда мы направляем анализы, находится в Салехарде. Метод диагностики называется ПЦР. Он узко направлен именно на выявление гриппа A/H1N1.

Результаты мы получаем в течение суток.

В том, чтобы проверять не каждого подозрительного гражданина, а только избранных, нет ничего криминального. Такой принцип изначально предполагался в случае пандемии. Важнее не столько выявлять «свиную составляющую» в общей гриппозности, сколько уметь быстро реагировать на переход гриппа в тяжелую стадию.

## Чем лечить и куда класть

— Положили в Первую инфекционную. Вообще такая больничка — ничегошная, — говорит москвич Виктор Т., успешно переболевший «свиным» гриппом. — У меня был отдельный бокс: знаете, такой со стеклянным предбанником, где врачи должны переодеться, прежде чем ко мне войти. Даже свой выход на улицу был — если меня нужно было куда-то отвезти на анализы, подъезжала машина, и меня грузили через этот выход.

Виктору повезло. Когда он болел, «свиной» грипп был еще редкостью. К каждому заболевшему относились как к сенсации. Что будет, если заболевание станет массовым, — непонятно. Чтобы предотвратить гибель человека в случае обострения, нужны палаты интенсивной терапии и аппараты искусственной вентиляции легких. Причем нужны быстро, счет может идти на часы и минуты. Сумеет ли российская система здравоохранения с этим справиться? Этот вопрос пока остается открытым.

Представители Минздравсоцразвития заверили нас:

— В больницах мест достаточно. Если количество больных возрастет, мы можем выделить несколько тысяч коек дополнительно в инфекционных и других больницах.

Хочется верить, что это так.

Точно так же медицинские чиновники уверяют, что лекарственных препаратов вполне хватит для борьбы с пандемией.

— Создан 50-процентный — от потребности — запас лекарств, который постоянно пополняется. В субъектах Федерации заключены прямые договоры с поставщиками лекарств для более быстрого реагирования на потребности. Лекарств хватит всем.

Тут уже есть поводы сомневаться. Примерно в трети московских аптек, которые обошли наши корреспонденты, не оказалось масок и некоторых препаратов, которые рекомендовано использовать для профилактики «свиного» гриппа. А в одной из столичных аптек даже градусники оказались в дефиците:

— Да, у нас на градусники очередь: два осталось — их вечером люди заберут. Попробуйте прийти завтра…

Впрочем, любовь российских граждан к самостоятельному выписыванию себе лекарств нередко чревата самыми печальными последствиями.

Другой вопрос — чем именно лечить «свиной» грипп.

— «Свиной» грипп чаще всего сопровождается высокой температурой, а при высокой температуре врачи иногда назначают антибиотики, — сокрушается Геннадий Ширшов. — Но антибиотики на вирусы не действуют. Они показаны при осложнении пневмонией, то есть на следующей стадии заболевания. А при «свином», да и при любом гриппе прописывать их категорически нельзя. Температуру при гриппе сбивать не нужно: есть температура — значит, организм борется.

Общепринятых схем лечения существует несколько. Росздрав рекомендует применять комбинацию отечественных препаратов: арбидол, индукторы интерферона типа кагоцела и комбинации двух видов интерферона.

Игорь Никаноров из НИИ гриппа РАМН считает, что такой набор вполне адекватен:

— Это стандартная схема, правильные рекомендации по антивирусной терапии. Арбидол — препарат отечественный, его цена вполне доступна.

Проводили исследования на клетках: вирусы действительно к нему чувствительны, в отличие от ремантадинового ряда. Впрочем, есть и такая схема: ремантадин и ношпа. В нашем институте ставили эксперименты — там результаты тоже положительные. Интерферон же назначается практически при всех вирусных заболеваниях. Есть статьи, которые подтверждают его эффективность. Есть еще препараты: ингарон, полудан…

Иными словами, Россия пошла своим особым путем, не делая ставку исключительно на популярный во всем мире препарат тамифлю. Основная причина — цена.

— Тамифлю — препарат хороший, никто под сомнение его эффективность не ставит, — поясняет Никаноров. — Но он дорогой: упаковка стоит около полутора тысяч. Кто, например, в Тверской области позволит себе такой препарат?

Прием лекарств, скорее всего, поможет конкретному больному, но теоретически может содержать угрозу обществу. Чем больше людей принимают препараты, тем выше шанс, что вирус приобретет к ним устойчивость. Отдельные такие случаи уже есть. Правда, они единичны. Но это только пока. А ведь распространение вируса с каждым днем набирает обороты.

И самой продуктивной защитой может стать только массовая вакцинация.

## Сантехники прививаются первыми

«Несколько миллионов доз вакцины уже наработали. 30 миллионов доз к январю мы, конечно, сделаем. Это работа без выходных, но сроки реальные, — рассказал «РР» представитель ФГУП «НПО “Микроген”», основного производителя вакцины от «свиного» гриппа. — После того как мы закроем госконтракт, мы будем производить вакцину по коммерческим заказам: для платной вакцинации, для иностранцев. Но это только в следующем году».

На селекторном совещании с руководителями региональных департаментов здравоохранения заместитель главы Минздравсоцразвития Вероника Скворцова обнародовала план действий:

— Иммунизация населения начнется 9 ноября. На первом этапе будет проведена вакцинация работников коммунальной сферы: служб газа, водоснабжения, электрообеспечения. На втором этапе, с 23 ноября, будут вакцинироваться медработники, преподаватели, студенты 5–6-х курсов медвузов…

Такая логика нас слегка смутила. Слесари-сантехники и газовщики — люди, конечно, уважаемые, но прививать их раньше врачей и учителей… Мы решили, что в стенограмму селекторного совещания вкралась ошибка, и на всякий случай




обратились за уточнениями в Минздравсоцразвития. Но там нам уверенно ответили: «Вакцинация начнется 9 ноября — с работников жизнеобеспечивающих служб».

Впрочем, это не так уж и важно. Медицинские чиновники обещают, что на первом этапе будут привиты 10 млн человек. На втором — еще 30 млн (здесь речь идет о группах риска — беременных, детях разного возраста, подростках, студентах, военнослужащих). В случае, если и это не поможет, прививки станут совсем массовыми и захватят до 100 млн человек.

И если наше государство сумеет все это выполнить, можно будет сказать, что эту войну мы выиграли.

**Авторы:**
*Юлия Вишневецкая, Ольга Андреева, Григорий Тарасевич, Ольга Цыбульская, Алексей Торгашев, Екатерина Шайтанова, Марина Соснина, Светлана Афанасьева, Юрий Якорь, Анастасия Цибулевская, Александра Лавренова, Юлия Саберова, журнал «Русский репортер»*



**«Зубру» беларускай журналістыкі Іосіфу Сярэдзічу споўнілася 60! Галоўны рэдактар «Народнай Волі» — легенда і «матор» незалежніцкага друку — спецыяльна для «А».**

# Іосіф СЯРЭДЗІЧ:

## *«Мая задача — зберагчы газету і паставіць дачку на ногі»*

***— Як адсвяткавалі, Іосіф Паўлавіч?***

— Я не люблю юбілейнічаць. У нас у рэдакцыі ёсць такое непісанае правіла: у дзень народзінаў ты можаш наогул не з'яўляцца на працу, і гэта не будзе лічыцца прагулам. Праўда, на гэты раз па просьбе калег я мусіў быў парушыць традыцыю. Бо юбілей выпаў на той дзень, калі здавалі ў друк чарговы нумар. Пасля працы накрылі стол, і хто заходзіў, падымаў кілішак-другі. Звычайна, у рабочым парадку.

Вядома ж, пасля гэтага сваякі, сябры, блізкія сабраліся ўжо за межамі рэдакцыі.

***— Падарунак сабе зрабілі? Здаецца, вы хацелі машыну памяняць.***

— Так, вельмі хацеў, але не зрабіў і не ведаю ўжо, калі зраблю. Маёй «Санаце» ўжо больш за дзесяць гадоў. Я купляў яе новую, але яна мне абышлася, вы не паверыце, менш як у пяць тысяч даляраў. Было так: прыходзіць да мяне сваяк, якому я колькі гадоў таму дапамог. І ён быў мне вінен пяць тысяч. Ну вось, прыходзіць і цягне мяне: «Усё, едзем, едзем, я стрымаю сваё слова». Вязе ў салон, дзе стаяць новенькія машыны. «Хюндай Саната» тады каштавала менш за дзесяць тысяч даляраў. І кажа мне:

«Пяць тысяч плачу я, астатняе — ты». Вось так я і купіў машыну.

Дарэчы, у хуткім часе мне расказалі, што «наверх» адразу паведамілі, быццам я на новенькім мерседэсе езджу. Мой хюндай серабрысты, можа, здалёк да мерседэса і падобны. Ужо не ведаю, праўда ці не, аднак казалі, што тагачасны кіраўнік адміністрацыі прэзідэнта патлумачыў Аляксандру Рыгоравічу, што ніякі гэта не мерседэс, а самая танная машына, якая не лічыцца прэстыжнай у асяродку багатых людзей.

Вось на ёй я ўжо дзесяць гадоў і езджу. А зраблю сабе ў рэшце рэшт падарунак ці не зраблю — не ведаю, бо трэба ў першую чаргу не згубіць «Народную Волю».

***— Цяжка трымацца?***

— Я працую ў журналістыцы больш за 40 гадоў і не памятаю ніводнага дня, каб мог сказаць: як лёгка я пражыў гэты дзень. Я мару пра тое, каб хоць адзін тыдзень адчуць, што я проста рэдактар, журналіст, што гэта мая прафесія і што я нікому не перашкаджаю жыць. Што ніхто за мной не сочыць, не арганізуе ў рэдакцыіператрус. Што ніхто не прыйдзе заўтра з кайданкамі.

Ніхто не любіць праўды. Ніхто не любіць нашага брата-журналіста. У многіх іншых краінах таксама не любяць. Але паважаюць! І вось наша задача — прымусіць нашых апанентаў, хто б гэта ні быў, паважаць нас за наш прафесіяналізм, лічыцца з намі. Любяць жа сёння толькі кішэнных журналістаў. Калі першая асоба любіць свайго рэдактара, ты ўжо рэдактар кішэнны, бо пад абцасам ходзіш. А для мяне, хто б ні быў на чале дзяржавы, — я б не памяняўся. Аднак калі ты сёння працуеш гэтак, як павінен працаваць, то ты павінен і разумець, што самае нечаканае можа адбыцца ў любы час.

## Ваяваў з уладамі дзеля праўды

***— А калі вярнуцца ў тыя часы, калі вы толькі пачыналі. Няўжо вам кепска жылося ў гады «махровага» застою?***

— Для большасці савецкіх людзей — так, гэта быў перыяд махровага застою. Для мяне ж асабіста ніякага застою не было. З 1966 года і па сённяшні дзень. У савецкія часы я ваяваў з міністрамі, сакратарамі ЦК партыі, даходзіў да Машэрава. Хаця тыя канфлікты так проста не даваліся.

***— І дзеля чаго ваявалі?***

— Я ж быў не апошнім журналістам. За праўду ваяваў! Яшчэ ў «Сельской газете» я надрукаваў артыкул «Как с одной свиньи две шкуры снимали». Тады паўстала праблема: калгасы і саўгасы не маглі здаць на мясакамбінат жывёлу. Каб прынялі нейкую сотню свіней, дырэктару саўгаса даводзілася суткамі абіваць парогі на мясакамбінаце, даваць хабар… Гэты праблемны матэрыял літаральна ўзарваў ЦК КПБ. Тагачасны міністр мясной і мясаперапрацоўчай прамысловасці спадар Баўрын, у бок якога паляцелі стрэлы, выпушчаныя журналістам-пачаткоўцам, абараняўся ўсімі сіламі. Была нават створана адмысловая камісія, і выявілася, што ўсё, пра што я напісаў, праўда.

А яшчэ была справа: тэлефануе ў газету сакратар ЦК па сельскай гаспадарцы Віктар Шавялуха: «Вы што, не ведаеце, што ў адным з саўгасаў у Сенненскім раёне робіцца? Там ад адной свінаматкі атрымліваюць па 24 парасяці, вырошчваюць іх на ўласных кармах, без дапамогі дзяржавы. І дабіліся стопрацэнтнага захоўвання маладняку. Трэба тэрмінова журналіста адпраўляць, рабіць паласу пра перадавы вопыт і ўкараняць яго па ўсёй рэспубліцы».

Тады я працаваў у аддзеле жывёлагадоўлі, сям'і яшчэ не было, на пад'ём быў лёгкі. Накіравалі — паехаў. А палове шостай раніцы з'явіліся мы з фотакорам на тым жывёлагадоўчым комплексе. Бачым: дзядзька нагрузіў сані дохлымі парасятамі, якія ноччу сканалі, і вязе да магільніка. Далей высветліў, што кормяць парасят не ўласнымі камбікармамі, а атрымліваюць іх па блаце на Ваўкавыскім



Пастаўскі раён, калгас імя Суворава, жнівень 1974 г. Сярэдзіч — карэспандэнт «Сельскай газеты». Інтэрв'ю з загадчыцай фермы



Калектыў «Народнай газеты»

камбікормавым заводзе. Самога дырэктара на месцы не аказалася, бо ён кінуўся ў Растоўскую вобласць, каб яшчэ адзін «перадавы» вопыт пераняць: Шавялуха яму давёў, што там трымаюць свіней і парасят увогуле ў намётах, і не трэба будаваць жывёлагадоўчыя комплексы.

Карацей, напісаў я артыкул пад назвай «Сплошная липа». Рэдактар «Сельской газеты» Андрэй Данілавіч Колас пачытаў: «Што ж, я адчуваў, што не таго паслаў». Я пачакаў колькі дзён, артыкул не друкуюць. І я, нічога не кажучы рэдактару, пайшоў у ЦК. Падрабязнасці скасую, але дайшоў я спачатку да сакратара ЦК па ідэалогіі Кузьміна, потым — да галоўнага памочніка першага сакратара Крукава, а затым і да самога Машэрава. Ён здзівіўся: такі малады хлопец, а б'ецца так сур'ёзна. Пасля яго ўмяшання артыкул надрукавалі. А Шавялуху, дарэчы, Машэраў раскусіў і штурхануў з рэспублікі.

Такіх прыкладаў я магу прывесці сотні, а ты кажаш, што лёгкія часы былі. Сапраўдны журналіст, у якую б эпоху ён ні працаваў, павінен быць як байцовы сабака. Галоўнае — ведаць, каго прыціснуць, за што і калі.

***— Іосіф Паўлавіч, вы працавалі і ў дзяржаўных выданнях, і ў незалежных. У чым розніца?***

— Мне шкада, што ў Беларусі гэтая розніца асабліва заўважная. А яе, па сутнасці, наогул не павінна быць. Вось сёння БелаПАН звярнуўся да адной публікацыі 1989 года ў «Советской Белоруссии» — «Национальные символы Беларуси: народ и история». Гэта быў першы асветніцкі матэрыял пра нацыянальную самасвядомасць. Яго аўтар, Міхась Ткачоў, знакаміты навуковец, не быў упэўнены, што дзяржаўная агульнанацыянальная газета надрукуе такі артыкул. Ён ужо хацеў забраць яго з рэдакцыі, але я адгаварыў, сказаў, што трэба пачакаць. І мы надрукавалі. Памятаю, галоўны рэдактар Аляксандр Кандратавіч Зінін, ад'язджаючы ў камандзіроўку, сказаў мне: «Я з'еду, а ты хуценька артыкул ціскані». Ён ведаў, што прасцей будзе потым абараніць намесніка перад бюро ЦК, чым самому ўтрымацца. Але ўсё абышлося.

Як бачыце, і ў тыя часы можна было прарваць інфармацыйную блакаду. Калі ў журналіста было імкненне, ён знаходзіў магчымасці гаварыць праўду.

## «Да маіх пальцаў не прыліпла ніводная капейка!»

***— Ці праўду казалі, што ў пачатку 90-х рэдактар «Народнай газеты» Сярэдзіч усім сваім супрацоўнікам кватэры павыбіваў?***

— Я думаю, што кожны кіраўнік павінен думаць не толькі пра тое, што друкуецца на старонках выдання, не толькі пра сваю ўласную кар'еру, а перш за ўсё пра людзей. Калі гэта было магчыма, я сапраўды дапамагаў вырашаць жыллёвыя пытанні. Памятаю, як яшчэ ў «Советской Белоруссии» выбіваў кватэру загадчыку аддзела партыйнага жыцця Сяргею Сверкунову, зараз ён галоўны рэдактар «Вячэрняга Мінска». У іх з жонкай Вольгай нарадзілася дзіця, а з жыллём былі праблемы. Дык я вырашыў праз гаркам партыі дзейнічаць, бо праз гэтую ўстанову мы «не прабівалі» яшчэ ніводнай кватэры. Я першага сакратара Таразевіча зморам браў: Сяргея пакінуў у прыёмнай, а сам вырашыў не выходзіць з кабінета, пакуль не атрымаю станоўчага выніку. І ён не вытрымаў майго напору. Падняў трубку, пазваніў у ЦК, заручыўся там падтрымкай. Мы з Сяргеем куляй прыляцелі

ў рэдакцыю, зрабілі патрэбную паперку, потым — на подпіс у ЦК, адтуль — у гаркам. А дні праз тры Сверкуновым выдзелілі кватэру на Магілёўскай.

Я гэта да чаго? Трэба людзям стварыць умовы для жыцця, тады яны і працаваць будуць добра. Калі мы падымалі «Народную газету», я паставіў пытанне перад Вярхоўным Саветам, каб дапамаглі супрацоўнікам з жытлом. А калі тыраж выйшаў на 500 тысяч, то грошай ужо ў самой газеты было столькі, што мы маглі і самі будаваць кватэры.

Дарэчы, на мяне ледзь крымінальную справу не завялі за кватэру для брэсцкага карэспандэнта «Народнай газеты» Васіля Сарычава. Калі мяне Лукашэнка хацеў скінуць з рэдактарства, нацкавалі на мяне рэвізію. Рэвізоры ўбачылі, што мы пабудавалі кватэру ў Брэсце, але не ўзгаднілі гэтае пытанне с Прэзідыумам Вярхоўнага Савета. А без іх, бачыце, не мелі права. Я тады рассмяяўся — пайшлі яны!.. Да маіх пальцаў не прыліпла ніводная капейка, я не для сябе і не для сваіх дзяцей будаваў гэтую кватэру. Потым, у нас ёсць дагавор з тым жа Сарычавым, дзе чорным па беламу напісана: калі ён не адпрацуе дзесяць гадоў у «Народнай газеце», то прапарцыянальна неадпрацаванаму часу заплаціць за кватэру. Гэта было самае значнае злоўжыванне маімі паўнамоцтвамі.

Сёння я ўжо не магу выбіць кватэры сваім журналістам. Але клапачуся аб тым, каб яны прыходзілі на працу не галодныя і каб хапала заробку на дах над галавой. Хоць сам я калісьці жыў нават на вакзале.

***— Праўда?***

— Так. Прыехаў вучыцца, а інтэрнат не далі. Дык я на вакзале тыдзень жыў, пакуль мяне не пашкадаваў старшыня студэнцкага прафкама Мікола Дрозд. Я ж не адразу трапіў на стацыянар, а пераводзіўся з завочнага на трэцім курсе. У 1966 годзе была рэформа адукацыі, два выпускныя класы. Конкурс шалёны. А тут нейкі хлопчык з палескай вёскі прыехаў паступаць на факультэт журналістыкі. Па конкурсе я не дабраў адзін ці два балы. А ў верасні быў яшчэ адзін паток для завочнікаў. Я хуценька вярнуўся дахаты, завёў працоўную кніжку і паступіў на завочнае. Два гады правучыўся на завочным. Працаваў у школе лабарантам, адмываў прабіркі ад хімрэактываў і кіно вучням паказваў. Потым у калгасе працаваў вызваленым сакратаром камітэта камсамола, у мяне было 159 камсамольцаў. Аднойчы я, як сумленны сакратар, пагрузіў на грузавік 30 даярак і свінарак і павёз іх у Пінскі райкам камсамола, каб выключыць з арганізацыі, бо яны ўнёскі ўжо год не плацілі. Першы сакратар райкама ледзь прытомнасць не страціў, калі ўбачыў гэтую карціну: «Едзьце хутчэй дахаты, пакуль з райкама партыі ніхто не ўбачыў. Потым выключыш іх, па адным».



***— Дык вы былі прынцыповым нават у 17 гадоў?***

— Мабыць, так. Наша камсамольская арганізацыя была лепшай у вобласці. Напрыклад, едзем гуляць у футбол з суседнім калгасам. Хлопцам што трэба? Каб у машыне стаяла хаця б дзве скрыні віна, па 12 бутэлек у кожнай. Каб потым перамогу адзначыць. Іду да старшыні калгаса, які ў той час быў былы дырэктар школы, дзе я вучыўся. Кажу: Мікалай Васільевіч, трэба нейкую капейчыну. Ён мне прапануе рублёў 50. Я яму — 150. Пачынаем таргавацца, сыходзімся на сотні. Усе задаволеныя. Збіраю хлопцаў, гуляем ад душы ў футбол, выйграем ці прайграем — не надта і важна. Потым у лес, святкуем. Вечарам — у клуб, і да раніцы танчым.

У той час на мяне нават хацелі завесці крымінальную справу. Неяк пракладалі ў нас высакавольтную лінію, навезлі слупоў, раскідалі па вёсках. А мы зрабілі вялізную танцпляцоўку, трэба было святло да яе падвесці. Дык мы з хлопцамі ноччу пазбіралі па суседніх вёсках гэтыя слупы, да раніцы іх укапалі, а на вечар замовілі аркестр з Пінска на ўрачыстае адкрыццё пляцоўкі. Участковы паабураўся, але выкопваць тыя слупы ніхто не стаў.

Рознае было. Студэнтам год пражыў у інтэрнаце пад прозвішчам Віктара Навуменкі, сына Івана Навуменкі. Нас у пакоі было шэсць чалавек, у тым ліку будучы знакаміты журналіст Толя Кудраўцаў. Ён быў з нейкай смаленскай глыбінкі, але паводзіў сябе гэтак, быццам выйшаў з князёў ці з каралеўскай сям'і. На чацвёртым курсе ён прапанаваў: «Хлопцы, навошта нам дзяжурыць па прыбіральнях, калі мы можам наняць бабку з бюро паслуг? Няхай яна тыдзень аддзяжурыць». Нанялі. На трэці дзень нас выклікаюць да прарэктара, тады ім быў Герой Савецкага Саюза Кірсанаў. Шыбуем

да яго і бачым: у кабінеце стаіць вялізная скураная трафейная канапа. Кудраўцаў заходзіць і на гэтую канапу — хлёп! Прарэктар раззлаваўся страшэнна: «Хто вам дазволіў?!» А Толя яму ў адказ: «Любы культурны чалавек спачатку запрашае сесці». Пасля чаго, зразумела, з намі ўжо размаўляць не сталі, мы куляй вылецелі ў калідор. А пакуль мы вярталіся ў інтэрнат, дык нас ужо паводле загаду ўсіх адтуль выселілі. Мне пашанцавала, што сын Івана Навуменкі ад першага шлюбу, Віктар, які вучыўся на фізфаку, якраз ажаніўся і пайшоў з жонкай на прыватную кватэру. А я папрасіўся пажыць па яго дакументах. Мы былі з ім кволыя, таму пад выглядам фізіка я пражыў у інтэрнаце цэлы год.

## «Лукашэнка абяцаў прыехаць з самагонкай»

***— Вам давялося шмат дзе папрацаваць. Якая рэдакцыя зараз успамінаецца часцей за ўсё?***

— «Советская Белоруссия». Які там быў рэдактар! І як мне сёння яго нестае! А «Народная газета»... Пэўны час мы мелі памяшканне ў Доме ўрада. Гэта была адзіная рэдакцыя за ўсю гісторыю беларускай журналістыкі, якая рабіла газету ў Доме ўрада. Чаму там? Таму што нас хацеў «прылашчыць» хітры Вячаслаў Францавіч Кебіч. Ён думаў, што я як дэпутат стану больш мяккі і як рэдактар буду на вачах. Мой пакой быў той самы, у якім раней сядзеў Шушкевіч. Журналісты займалі таксама добрыя кабінеты. Валера Драздоў, які вёў тэматыку ўрада, атрымаў кабінет у тым крыле, дзе ўрад і знаходзіўся. А ў Драздова была звычка днём выпіць і паспаць. Дык ягоны храп тады разносіўся на ўвесь Дом урада. Прыбягаюць да мяне чыноўнікі: «Там ваш хлопец так храпіць! Зрабіце што-небудзь». Адчыняю кабінет — на белай канапе спіць Драздоў. Чаго толькі ні было! Ладзілі «пікнікі» на працы з салам і бульбай. Галоўнае было пранесці міма вахты чыгуны. Ну як можна было не адзначыць першы нумар 16-палоснай вялікай газеты? У той час гэта была ці не рэвалюцыя.

***— А ці памятаеце сваю першую сустрэчу з Аляксандрам Рыгоравічам Лукашэнкам?***

— Гэта было яшчэ да «Народнай газеты», я тады працаваў у «СБ» намеснікам рэдактара. Раздаецца званок другога сакратара ЦК Кампартыі Беларусі Мікалая Ігрунова: «Ты ведаеш, што мы адкапалі самародка? Першы сакратар ЦК Сакалоў і сакратар па сельскай гаспадарцы Дземянцей патэлефанавалі толькі што са Шклоўшчыны. Едзь і ты як былы аграрнік у саўгас «Гарадзец». Там дырэктар Аляксандр Лукашэнка выводзіць сельскую гаспадарку Беларусі на шырокі прастор — укараняе метад гаспадарчага разліку». Само па сабе гэта было новым, але яны тады галоўнага не зразумелі: калі застаецца саўгас, а гэта нічэйная ўласнасць, ты хоць сто розных схем прыдумай, аднак яны не будуць працаваць.

Мы паехалі з фотакорам Аляксандрам Шаблюком у Шклоў. Гэта быў 1988 год. Акрамя нас у раён прыехала яшчэ цэкоўская група, каб таксама напісаць пра перадавы вопыт. Я прапанаваў Аляксандру Рыгоравічу: няхай фотакарэспандэнт зробіць добры панарамны здымак, а матэрыял мы напішам, калі пазнаёмімся з цэкоўскай даведкай. Здымак, дарэчы, добры атрымаўся: стаіць шмат народу, а наперадзе, як малады Ленін, правадыр Аляксандр Рыгоравіч. Мы яго на ўсе восем слупкоў на першай паласе газеты і паставілі. А як працяг — публікацыю Лукашэнкі. Ён прыязджаў яе вычытваць, падхапіў мяне пад рукі, радасны. Шчырую падзяку рэдактару таксама выказаў. Сказаў, што «ў наступны



Германчук, Карпенка, Сярэдзіч, Саннікаў.
Еўрапейскі парламент, Брусель, 1998 г.

раз, хлопцы, прыеду з бутэлькай самагонкі». Але не прывёз.

А калі ён здымаў мяне з пасады, дык тлумачыў майму калектыву, што, маўляў, «хачу выратаваць Сярэдзіча, бо гэта той чалавек, які адыграў у маім лёсе значную ролю. Але я павінен яго выратаваць, таму што ён апынуўся ў палоне пазнякоўцаў, БНФ і іншых».

***— А ўсё ж такі за што здымаў?***

— Адчуваў, што на свой бок мяне не перацягне. Увечары раздаўся тэлефонны званок: «Вас беспокоит адъютант президента Республики Беларусь. Президент приглашает вас завтра в 8 часов утра на встречу». Я адразу зразумеў, што гэта будзе апошняя размова. Я патэлефанаваў Мечыславу Грыбу з прапановай на 7 гадзін раніцы склікаць прэзідыум Вярхоўнага Савета, каб выпрацаваць пэўную тактыку, абараніць мяне як рэдактара. Я да таго не раз на прапанову пакінуць крэсла рэдактара «Народнай газеты» адказваў прэзідэнту, што на пасаду мяне прызначыў Вярхоўны Савет, яму мяне і звальняць. Але Грыб са сну так і не спадобіўся на такі кардынальны крок. Словам, я пайшоў раніцай да Лукашэнкі. А ён трымае дзве паперы: адну з указам аб маім вызваленні ад пасады, а другую — чыстую. Я фактычна мог сам выбіраць сабе любую іншую пасаду. Але сысці з рэдактарства?! Я адмовіўся, і Лукашэнка адкінуў чысты ліст, і тут жа ўказ падпісаў, быццам «Народная газета» расколвае грамадства… Я выйшаў, патэлефанаваў Грыбу, сказаў, што ў іх больш няма рэдактара, а хутка не будзе і газеты. Так і адбылося.

***— Іосіф Паўлавіч, вы ж разумееце, што сёння прэзідэнт, калі б толькі захацеў, лёгка прыхлопнуў бы і «Народную Волю». Чаму не робяць гэтага?***

— Сёння кожны разумны чыноўнік павінен быць мне ўдзячны ў тысячу разоў болей, чым любому майму калегу з дзяржаўнай газеты. Незалежныя сродкі масавай інфармацыі — гэта для іх глыток свежага паветра. Мы многім расплюшчваем вочы. Разумныя чыноўнікі моляцца сёння на «Народную Волю» і на таго ж Сярэдзіча. Мы што, ворагі сваёй краіны? Мы што, хочам горш зрабіць?

Калі б заўтра «Народная Воля» выйшла тыражом 700 тысяч, нам было б, зразумела, цяжэй. З такім тыражом мы б расплюшчылі вочы не толькі чыноўнікам, але і таму электарату, якому даўным-даўно начапілі ружовыя акуляры. Але ж такім тыражом нам ніхто не дасць выйсці, бо любая ўлада баіцца згубіць сваё месца. Я так лічу: гісторыя пакарае сённяшнюю ўладу не за спазненне з нейкімі рэформамі, а за расчалавечванне чалавека. За тое, што яны перакрылі кісларод незалежным сродкам масавай інфармацыі, свабоднаму слову. Савецкая прапаганда ў параўнанні з сённяшняй і блізка не стаяла. Я ж памятаю, якой была газета «СБ» у савецкі час і што такое «СБ» сёння, якім было тэлебачанне Генадзя Бураўкіна і што такое тэлебачанне Зімоўскага. Раней у аснове дзейнасці журналістаў усё ж такі ляжала творчасць. Ідэалогія прысутнічала, але не такім актыўным чынам. А сёння ідэалагічныя «танкі» проста напралом пруць!

***— Ці падтрымліваеце стасункі са сваімі калегамі з дзяржаўных СМІ? З сённяшнім галоўным рэдактарам «Советской Белоруссии» Паўлам Ізотавічам Якубовічам, напрыклад?***

— Апошнія два гады амаль не падтрымліваем, бо зразумелі: я не магу перацягнуць яго ў сваю «веру», а ён мяне — у сваю. Але ж некалькі хвілін таму ён патэлефанаваў мне і павіншаваў з юбілеем.

***— Чаго, на ваш погляд, не хапае сучасным маладым журналістам?***

— Мне хацелася б, каб больш самаахвярнасці было ў журналістыцы. Хоць мяне за гэта маладыя журналісты і крытыкуюць, гавораць, што «Народная Воля» з гэтай самаахвярнасцю падобная да газеты «Правда» 1950-х гадоў, а не да сучаснага друкаванага выдання, якое павінна толькі інфармаваць, а не ўвязвацца ў вайну з уладай.

***— А вы не згодны?***

— Згодны. Тэарэтычна ўсё слушна. Але ж трэба ўлічваць, што сёння людзі не атрымліваюць



Сярэдзіч раздае газету. Ланцуг неабыякавых чытачоў, Кастрычніцкая плошча, Мінск, чэрвень 2004 г.

інфармацыю з дзяржаўных СМІ, яны атрымліваюць толькі прапаганду. Значыць, павінна быць нейкая альтэрнатыва той жа «Советской Белоруссии». Тут мы павінны прайсці пэўны асветніцкі этап.

Увогуле, добра ўжо тое, што «Народная Воля» выжыла ў той час, як іншыя выданні зніклі. Наступным годам нам споўніцца 15 гадоў. За гэты час мы тройчы былі ў эміграцыі — два разы ў Літве, і не па месяцы, а па пары гадоў. Больш як тры





гады друкаваліся ў Смаленску. Ёсць у нас нумар газеты, які прайшоў палон і дзе былі надрукаваны ўсе выступленні Казуліна. Нумар арыштавалі на мяжы, калі мы яго везлі са Смаленска, пратрымалі ў Віцебску два гады, а потым міліцэйскае начальства само з Віцебска прыцягнула гэтыя 300 тысяч экзэмпляраў у нашу мінскую рэдакцыю.

***— Вам двухмоўе ў газеце не замінае?***

— На жаль, сёння перайсці ў адзін момант толькі на беларускую мову — гэта, як ні прыкра казаць, азначае страціць частку чытачоў. Пераходзіць цалкам на расейскую мову таксама не будзем, бо згубім нацыянальную ідэю. Мову трэба захаваць. І газету неабходна захаваць. Таму на нашых старонках пакуль дзве мовы.

## «Як мужчына я адбыўся»

***— Іосіф Паўлавіч, мы так падрабязна пагаварылі пра вашы кватэрныя подзвігі дзеля іншых. А як пачуваецеся самі?***

— Дык мне няма чаго хаваць. Я сваю кватэру атрымаў, калі працаваў яшчэ ў «Советской Белоруссии». Разам з Мясніковічам атрымлівалі. Кватэрка была не самая горшая, чатырохпакаёвая, на Старавіленскім тракце. А калі сын ажаніўся і на адной кухні пачалі дзве жанчыны таўчыся, пайшоў параіцца да Ярмошына, які тады быў намеснікам мэра Мінска, як бы гэта вырашыць праблему з набыццём асобнай кватэры. У той час горад якраз пачынаў прадаваць жытло. Ярмошын мне параіў уступіць у кааператыў і будавацца. Вярнуўся дахаты, расказаў жонцы, мы пайшлі з шапкай па сваяках, назбіралі, колькі не хапала. І пабудавалі двухпакаёвую кватэру ў раёне Вяснянкі, яна тады каштавала тысяч шэсць. Сын з сям'ёй пераехаў туды. А я хутка зазбіраўся за горад. Гэта мяне Якубовіч падбіў.

Ён да мяне яшчэ ў 1992 годзе прыбег, мы тады разам працавалі ў «Народнай газеце»: «Юзаф, Тарасава разбіраюць!» А я нават не ведаў, дзе гэта. Якубовіч патлумачыў: ад горада блізка, роза вятроў добрая. Трэба папрасіць, каб для «Народнай газеты» далі пару ўчасткаў.

Я хуценька напісаў ліст, і нам з Якубовічам далі па ўчастку на гары. Праходзіць паўгода, я туды прывожу якіх пяць блокаў, а Якубовіч ужо пачаў будаўніцтва. Зіма будоўлю замарозіла. Вясной кажу: «Паша, ты чаго не з'яўляешся дом будаваць?» Аказалася, ён ужо прадаў гэты ўчастак і купіў дом сярод хвояў пад Ждановічамі, побач з генераламі. А я не спалохаўся цяжкасцей і ўсё ж такі пабудаваў на гары дом з бярвенняў. І пераехаў жыць туды. Дзесяць гадоў ужо як вясковы жыхар. І гэтак здарылася, што пасля пяцідзесяці мне давялося займацца яшчэ адным будаўніцтвам — будаваць новую сям'ю.



З дачкой Ганнай (маці Сярэдзіча таксама звалі Ганнай)

***— Сівізна ў бараду, а чорт у рабрыну?***

— Не, зусім не так. Калі б мне хто сказаў, што пасля 50 у мяне будзе новая сям'я, цудоўная дачка, якой сёння ўжо шэсць гадоў, я б не паверыў. Злом, гістарычны злом! Вось што такое жыць на гістарычным зломе!

Жонка, калі даведалася пра гэты ўчастак, адразу заявіла: «Ты дурань. Навошта табе гэты ўчастак? Я ў вёску не паеду». А я будаваў не катэдж, а звычайную беларускую хату. Заказаў зруб на Палессі, прывёз сюды, сабраў.

І ўсе гэтыя гады, пакуль я хадзіў з сякерай вакол таго дома, Света, першая жонка, казала, што не паедзе. Я думаў, што гэта — абы гаварыць... А яна пайшла на прынцып. І вось набліжаецца маё 50-годдзе, я збіраюся трывала перабрацца ў вёску і пытаюся: «Хто едзе са мной?»

Сын і нявестка гавораць, што дзеці маленькія, у горадзе ім лепей — паліклініка, садок, школа. А жонка зноў: «Не паеду!»

Прайшоў час. Я ўжо там свой юбілей адзначыў, наваселле зрабіў. І ў рэшце рэшт даў жонцы час на пераезд. Я тады Якубовіча не раз узгадваў: мяне падбіў, сам збег, а ў мяне цяпер разбураецца сям'я праз гэтае перасяленне.

Прайшло з паўгода. Света так і не пераехала... А я сустрэў дзяўчыну, Наташу. У яе сям'і не было. Сябры нас пазнаёмілі. Яна маладзейшая за мяне на 15 гадоў. Я ўсё пазіраў на яе: прыгожанькая, добрая. І калі я ўжо атрымаў права быць свабодным ад першага шлюбу, тады спытаў у яе: «Наташа, ты не супраць, калі мы пабудуем з табой новую сям'ю?» Яна згадзілася. А тут праз тыдзень прыязджае мая першая жонка з усімі манаткамі: «Я буду тут жыць». А я ж ужо паабяцаў Наташы, і яна ўжо займаецца ўладкаваннем хаты. Што рабіць? Адмовіцца — ты сволач. Адмовіць першай жонцы — у яе вачах таксама сволач. Я сказаў: «Света, хто перашкаджаў табе пераехаць да мяне паўгода таму? Цяпер я перад табой не нясу ніякай маральнай адказнасці. Мы выхавалі сына, больш дзяцей няма. Ты дарослы чалавек, у цябе ёсць кватэра. Усё, я падаю на развод, таму што даў слова іншаму чалавеку».

Тыдзень быў вэрхал. Ох і цяжка было! Гэта сёння ўсё ўладкавалася, і я задаволены, што менавіта гэтак усё здарылася. І мы сустракаемся сёння цывілізавана, ціха. На душы ў кожнага сваё, але ж усё прыстойна.

***— Дачку не страшна было нараджаць у такім узросце?***

— Ну, 50 з лішнім гадоў — гэта ж яшчэ не канец жыцця. Мая задача — паставіць дачку на ногі. Яшчэ дзесяць гадоў — і яна амаль дарослы чалавек. А калі маці маладзейшая, то будзе яшчэ



**ДАСЬЕ «АБАЖУРА»:**

Іосіф СЯРЭДЗІЧ — вядомы беларускі журналіст, заснавальнік і галоўны рэдактар незалежнай газеты «Народная Воля». Нарадзіўся на Піншчыне 1 кастрычніка 1949 года. Журналістыкай займаецца з 1967 года. Скончыў журфак БДУ і Акадэмію грамадскіх навук пры ЦК КПСС. Працаваў карэспандэнтам у ганцавіцкай раённай газеце «Савецкае Палессе», у «Сельской газете», загадчыкам аддзела, намеснікам, першым намеснікам галоўнага рэдактара ў «Советской Белоруссии», з 1990 па 1995 год займаў пасаду галоўнага рэдактара «Народной газеты» — органа Вярхоўнага Савета РБ. Быў звольнены з пасады ўказам прэзідэнта А. Лукашэнкі. У 1995 годзе стварыў незалежную газету «Народная Воля».

Жанаты двойчы. Ад першага шлюбу сын Руслан, ад другога — дачка Ганна. Шчаслівы дзед 14-гадовага ўнука і 10-гадовай унучкі.

падтрымкай і для маці. Часам бывае, што нельга даць дзіцяці і за сорак гадоў сумеснага жыцця тое, што можна даць за тыя ж 15–20 гадоў. Думаю, Бог дасць мне яшчэ пажыць. Я задаволены, што сёння як мужчына адбыўся, таму што ёсць сын і ёсць дачка, ёсць дом і ёсць сад, ёсць жонка і ёсць газета.

***— Чым жонка займаецца?***

— Яна займаецца выхаваннем дачкі. І вырашыла атрымаць другую адукацыю, толькі што закончыла наргас.

***— А сын вас не асудзіў?***

— Не. У нас усё адкрыта было, Руслан ведаў сітуацыю. Ён, дарэчы, прадаў нашу чатырохпакаёвую кватэру і купіў недабудаваны катэдж у Тарасаве. Недалёка ад нас жыве.

## «Сярэдзіч усё жыццё прызямляецца на лапкі»

***— Іосіф Паўлавіч, даўно хацела вас спытаць пра гісторыю з Пэзяй Чіздэрясам. Гэта праўда ці легенда?***

— Першы раз чую! Раскажы! Цікава паслухаць.

***— Размова пра ваш першы матэрыял у раённай газеце. Ходзіць такая легенда, што вы ўсё думалі, як яго падпісаць: Іосіф Сярэдзіч? Язэп Сярэдзіч? Падпісалі: «Язэп Сярэдзіч». А лінатыпістка набрала наадварот. І выйшла ў газеце — Пэзя Чіздэряс.***

— Во даюць! Хто ж гэта склаў такую легенду? Я так разумею, той, хто хоча нацкаваць шчырых беларусаў на «яўрэя» Сярэдзіча. Але ж Язэп Сярэдзіч ніколі яўрэем па нацыянальнасці не быў. Я палескі хлопец. Вось ад таго, што журналіст Сярэдзіч, калі спатрэбіцца, можа дзесяць яўрэяў ашукаць, не адмаўляюся. Гэта прыродны дар. Кажуць, пацука як ні кідай у сцену, ён усё адно на лапкі прызямліцца. Так і Сярэдзіч усё жыццё прызямляецца на лапкі.

***— На пенсію не збіраецеся?***

— Якая пенсія?! Пакуль я жывы, ніхто не адбярэ ў мяне права працаваць. Не буду я газету выдаваць — сад падыму. Не будзе саду — яшчэ адзін дом пабудую. Не пабудую дом — дзіця нараджу.

***— Няўжо не стаміліся?***

— Стаміўся. І калі б змянілася сітуацыя, з задавальненнем перадаў бы газету ў надзейныя рукі. Але каб я быў упэўнены, што яе не прыхлопнуць. Нельга дапусціць, каб пацярпелі людзі, калектыў. «Народная Воля» і так выжывае насуперак «здароваму» сэнсу. У такой сітуацыі, як казалі замежныя калегі, не выжываюць. Мабыць, мы насамрэч жывем і працуем насуперак шматлікім цяжкасцям і перашкодам.

*Размаўляла Наталля Крывец*

Роўна дзесяць гадоў таму газета «Віцебскі кур'ер» надрукавала інтэрв'ю з Іосіфам Сярэдзічам пад загалоўкам «БОЯТЬСЯ НЕКОГДА». Сёлета яго аўтар, ветэран беларускай журналістыкі Сяргей Будкевіч, падкінуў цікавую ідэю: паглядзець на Сярэдзіча тагачаснага — што змянілася? Прывядзём некалькі цытатаў з той гутаркі.

*— Иосиф Павлович, основывая «Народную волю», вы начали дело не просто с нуля, а на дымящихся, можно сказать, руинах. Была разгромлена созданная и возглавляемая вами «Народная газета». Сейчас уже не все помнят, что она была самой читаемой в Беларуси, ее тираж зашкаливал за 600 тысяч экземпляров. Сейчас в стране нет столь массовых изданий.*

— Очень многие читатели той, давней уже, «Народной газеты» стали приверженцами «Народной воли», увидев в ней преемницу «Народной газеты» начала 90-х годов.

*— Но ведь уже тогда, в начале 90-х, наметилось негативное отношение сильных мира сего к вашей «Народной газете». И зародилась эта неприязнь именно среди депутатов Верховного Совета — того самого, который дружно проголосовал за учреждение «Народной газеты». Чем вы это объясните?*

— «Народная газета» появилась на свет почти одновременно с принятием суверенитета Беларуси, утверждением ее исторической символики — герба «Погоня», бело-красно-белого стяга. Но не надо забывать, что все это происходило на гребне демократической эйфории, вызванной бесславным поражением ГКЧП, крахом компартии. Однако сторонники тоталитарного режима не разбежались, а лишь временно спрятали, как страусы, головы в песок.

«Народная газета» начала выходить в октябре 1990 года, уже к зиме она издавалась тиражом в двести тысяч экземпляров, а в 1994 году, при тираже более полумиллиона, ее читала вся страна.

Да, депутаты назначили редактором парламентской газеты меня, своего коллегу, надеясь, что «Народная газета» станет доступной для каждого члена парламента. Так оно и вышло. Газета публиковала всех депутатов. В том числе и Зенона Позняка, Виктора Гончара, Сергея Наумчика и других, точка зрения которых не совпадала с настроениями «агрессивно-послушного большинства». Казалось, что бурному развитию газеты не будет конца. Но депутаты вскоре обеспокоились именно тем, что влекло читателей к изданию, новому во всех отношениях: оригинальному по верстке, насыщенному новостями, расследованиями, нелицеприятной критикой в адрес властных чиновников и тех же

депутатов, если они заботились не о народе, а о личной корысти. Раз за разом, от сессии к сессии, парламентарии-коммунисты поливали газету грязью, требовали внеочередного отчета редактора: надеялись, придравшись к какой-нибудь мелочи, отстранить меня от руководства редакцией. Но авторитет «Народной газеты» был уже слишком велик, чтобы меня можно было мигом свалить.

(…)

***— На что вы рассчитывали, создавая новую газету, «Народную волю»? Ведь у вас абсолютно ничего не было: ни денег, ни сотрудников, ни помещения...***

— У меня были дружеские связи с людьми, которые долгое время помогали «Народной газете». Эти люди, в основном предприниматели-промышленники, помогли начать новое дело, арендовать помещение, пригласить на работу штатных журналистов, машинисток, купить оргтехнику и бумагу. Способствовал и авторитет «Народной газеты» и ее недавнего редактора в административных кругах. Многие чиновники, прежде недовольные позицией «Народной газеты», со временем все больше понимали, какое важное дело она делала. Поэтому и не слишком препятствовали становлению «Народной воли».

***— И все-таки руководить независимым изданием сегодня очень трудно. Как же удается выжить «Народной воле»?***

— В Беларуси, в отличие от остального мира, издавать газету — дело заведомо убыточное. Надо искать нетрадиционные источники финансирования. Ведь и рекламу сейчас заполучить очень трудно. Руководители предприятий, даже частных, боятся «засвечиваться» на страницах опальной газеты. Я предложил своим бывшим компаньонам, делящим со мной права на редакционное помещение: «Мы будем пользоваться площадью, а рассчитаемся с вами бесплатной рекламой». Ответ был такой: «Вы пользуйтесь, а нам реклама не нужна. Власть увидит, что мы сотрудничаем с «Народной волей», и тогда беды не оберешься».

***— Если с рекламой туго, где же взять средства на издание?***

— В ближайшее время я открываю пивной бар в одном из рабочих районов Минска. Получил лицензию на торговлю и надеюсь на прибыль, которая поможет выпускать газету. Кроме того, стремлюсь экономить, насколько это возможно. Но не за счет зарплаты сотрудников, а за счет скромного их штата. Один работник «Народной воли» трудится за четверых государственных. Я сам вожу машину, езжу не на какой-нибудь иномарке за сотни тысяч долларов, как это делают редакторы государственных изданий, а на «Жигулях» за две тысячи. Лучше людям за труд платить достойно, чем транжирить деньги на престижные машины. Я не построил себе многоэтажный коттедж, когда это делали другие депутаты, а вложил сбережения в «Народную волю». Поставил деревянный дом в деревне, где живу теперь все теплое время года, снимаю стрессы, прогуливаюсь босиком по росе. Если бы не режим экономии, вряд ли «Народная воля» могла бы существовать. А она существует, и скоро мы отметим выход ее тысячного номера.

***— Вы не боитесь, что власти прикроют ваше издание? Ведь юридических возможностей для этого хватает...***

